стояния организма спортсмена, но и выявить те "пики" в волнообразности и скачкообразности тренировочного процесса, которые позволяют осуществить его на современном высоком уровне.

Несомненно, интенсификация тренировочного процесса требует изыскания простых и надежных критериев для оценки функционального состояния организма и, следовательно, методов и средств для ускорения восстановительных процессов.

Из-за отсутствия срочной информации о функциональном состоянии нервно-мышечного аппарата во время тренировки преподавателю порой трудно определить степень утомления отдельных мышц. В этих случаях и преподаватель, и спортсмен нередко прибегают к массажу. На наш взгляд, применение его, время и сила воздействия должны быть строго конкретизированы.

Таким образом, предлагаемый нами способ измерения кожных электрических потенциалов может успешно применяться для оперативного контроля за функциональной подготовленностью мышечной системы спортсменов, а полученные данные могут использоваться для управления процессом спортивной тренировки.

УДК 378.02

В. А. Кузьміч, ст. выкладчык

## НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

In this paper of Kuzmich V. A. is observed the understanding of importance of education of young people at this modern point of the development of society. The author is communicating to operational and pedagogical experience which is carried out on the department of belorussian language. The foundation of education is integral systemic-active approach providing the involving to pedagogical process of the another potential component. The main education role is teken with belorussian language, national culture and traditions in the world context.

На ўсіх этапах нашага грамадства пытанне выхавання моладзі было і будзе актуальным. І тым не менш мы чуем ушчуванні на лад жыцця, на прычыны, якія як быццам ускладняюць працэс выхавання моладзі. Сённяшнім днём мы скардзімся на сацыяльную няўпэўненасць, агрэсію і жорсткасць, алкаголь і наркотыкі. Раней былі іншыя праблемы. І будуць яны заўсёды. На нашу думку, прычыны і наступствы негатыўных з'яў дыялектычна ўзаемазалежныя. Гэта адсутнасць або недахоп выхавання.

Разгледзім, што ж уяўляе сабой працэс выхавання. Класічнае тлумачэнне гэтага тэрміна заключаецца ў наступным: выхаванне – гэта навыкі паводзін, прывітыя сям'ёй, школай, асяроддзем, якія праяўляюцца ў грамадскім і асабістым жыцці. Такім чынам, асоба з'яўляецца будаўнічай цаглінкай грамадства, паколькі грамадства ў пэўнай ступені з'яўляецца прадуктам дзейнасці яе членаў. Грамадства – гэта вынік выхавання людзей. Агульны працэс выхавання, праз які мы засвойваем ад іншых людзей сацыяльныя ролі, вядомы як сацыялізацыя. Па меры таго як становімся паўнапраўнымі членамі пэўнай супольнасці, мы далучаемся да працэсу інкультурызацыі, знаходзім свае ролі ў грамадстве і засвойваем пэўныя культурныя каштоўнасці. Сацыялізацыя асобы пачынаецца ад нараджэння і працягваецца ўсё жыццё. На яе непасрэдна ўплываюць змены ў навакольным асяроддзі. Грамадскія ўмовы пастаянна мяняюцца, і людзі вымушаны прыстасоўвацца да гэтых змен. Спосабы прыстасавання людзей часткова залежаць як ад сутнасці грамадскіх змен, так і ад традыцыйных узораў паводзін і светапогляду. На

сённяшні дзень пачалі нараджацца новыя станоўчыя зрухі ў сістэме выхавання, інакш кажучы, традыцыйныя ўзоры паводзін і светапогляду ў кантэксце адукацыйнай сістэмы напаўняюцца новым зместам. У цэнтры ўвагі агульначалавечыя каштоўнасці, культура кожнай асобы. Усведамленне самакаштоўнасці чалавечага жыцця, арыентацыя на адраджэнне нацыянальных духоўна-маральных каштоўнасцей вызначаюць стратэгію выхавання на кафедры беларускай мовы БДТУ.

Канцэптуальнай асновай выхавання з'яўляецца **інтэгральны сістэмна-дзейнасны падыход,** сутнасць якога вызначаецца цесным узаемадзеяннем **патэнцыяльных кампанентаў выхавання ў лакальных межах**. Зыходзячы з таго, што мова не з'яўляецца партыкулярнай дысцыплінай, а спрыяе засваенню ведаў аб навакольным свеце, найбольш мэтазгодным бачацца тыя падыходы да выхавання, якія забяспечваюць інтэгральнае ўспрыняцце маральна-этычнай, нацыянальнай, грамадзянскай, гендэрнай, псіхалагічнай, эстэтычнай, экалагічнай і іншых адгалінаванняў традыцыйнай культуры праз сродкі вербальнага (моўнага) ўздзеяння. Такім чынам, забяспечваюцца не толькі прадуктыўнасць выхавання, але і якасць фарміравання змястоўнага ядра маўленчай асобы. У аснову выхавання пакладзены дзяржаўныя дакументы: Асноўныя напрамкі развіцця сістэмы адукацыі (Пастанова Савета Міністраў ад 12 сакавіка 1999 г., № 3801), а таксама Канцэпцыя выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Новая выхаваўчая парадыгма грунтуецца на роўнасці разнастайных відаў сацыяльна-магчымага выхаваўчага вопыту (выхаванне на народных традыцыях, свецкае выхаванне, выкарыстанне народнай педагогікі беларусаў і інш.) А галоўнае, па меркаванні кафедры, выхаванне мовай, дакладней, мовай у дзеянні. Прыярытэтныя прынцыпы выхавання ў ВНУ прадугледжваюць:

– **навуковасць** – апора на псіхалагічныя асаблівасці студэнтаў, выкарыстанне ў выхаванні апошніх дасягненняў псіхалагічнай і педагагічнай думкі. Так, кафедрай распрацоўваюцца шляхі фарміравання моўнай кампетэнтнасці ў студэнтаў. Гэта не толькі заняткі, якія праводзяцца на высокім навукова-метадычным узроўні, але і шэраг канферэнцый, дыскусій, шырокі ўдзел у студэнцкай навуковай працы, які грунтуецца на свабодным волевыяўленні;

– **прынцып прыродазададзенасці**, які грунтуецца не толькі на прыродных задатках індывіда (студэнта), але і на псіхафізіялагічных магчымасцях чалавека і іх абумоўленасці інфармацыйнымі і сацыяльнымі з'явамі. Сведчаннем таму з'явілася наладжаная на кафедры праца псіхолагаў з выкладчыкамі і студэнтамі. Супрацоўнікі не толькі авалодалі метадамі інтэрактыўнага навучання і выхавання, але і істотна павысілі свой навуковы ўзровень у галіне псіхафізіялогіі і псіхалінгвістыкі (навука, якая займаецца працэсам маўлення), што з'яўляецца неабходнай умовай эфектыўнай працы з вербальнымі сродкамі ўздзеяння на моладзь;

– **прынцып суаднесенасці з культурай**, які праяўляецца як сукупнасць усіх формаў духоўнага жыцця грамадства, што абумоўліваюць фарміраванне асобы, сацыялізацыю маладога пакалення, засноўваючыся на каштоўнасцях нацыянальнай і сусветнай культуры (арганізацыя разнастайных сустрэч з культурнымі дзеячамі, наладжванне тэматычных заняткаў у музеях, наведванне выстаў і інш.);

– **прынцып талерантнасці**, які грунтуецца не толькі на павазе да індывідуальнасці студэнта (адмаўленне ад любых формаў псіхічнага ўздзеяння), але і да прадстаўнікоў нацыянальных і рэлігійных супольнасцей Беларусі, якія вучацца ў БДТУ і адносяцца да пэўнага веравызнання і нацыянальнай культуры. Кожны чалавек

ідэнтыфікуе сябе з нейкай культурай, таму штучнае навязванне чужых ідэалаў падсвядома робіць негатыўны ўплыў на псіхіку навучэнца. Стала добрай традыцыяй запрашаць на сустрэчы да студэнтаў і аспірантаў цікавых людзей розных нацыянальнасцей і рэлігійных канфесій. Святочны вечар-сустрэча з прадстаўнікамі нацыянальных супольнасцей Беларусі стаў сапраўдным святам, калі свае культуры, мовы, цікавыя планы на будучае прадстаўлялі татары, палякі, яўрэі, украінцы, рускія, немцы;

– **прынцып сувязі выхавання з жыццём** праяўляецца праз улік выкладчыкамі-куратарамі эканамічных, сацыяльных, экалагічных, дэмаграфічных і іншых умоў жыццядзейнасці студэнтаў. Гэта найперш праца ў інтэрнатах: гутаркі, сустрэчы з урачамі, журналістамі, эколагамі, эканамістамі. Гэта сустрэчы з бардамі, паэтамі, журналістамі, правядзенне разнастайных віктарын, займальных падарожжаў;

– **прынцып адкрытасці выхаваўчых сістэм** зыходзіць з аптымальных суадносін разнастайных мадэлей, жыццёвага вопыту асобы ў яе рэальнай жыццядзейнасці (прыкладам служыць выхаваўчая праца з аспірантамі. Спачатку вызначаюцца цікавыя і неардынарныя тэмы, згодна з якімі наладжваюцца адпаведныя сустрэчы: (напрыклад, з канд. філ. навук Л. Савік, рэжысёрам і дыктарам Палтаўскага тэлебачання І. Снарскай, бардамі А. Мельнікавым і А. Камоцкім, гісторыкам А. Крывальцэвічам, літаратуразнаўцам В. Чамярыцкім, паэтам Л. Дранько-Майсюком, археолагам А. Трусавым і інш.);

– **прынцып варыяцыйнасці**, які дэкларуе адпаведнасць зместу выхавання зменлівым патрэбам і інтарэсам моладзі (серыя сустрэч з урачамі рознага профілю, рэжысёрамі і драматургамі, прагляд новых спектакляў, ажыццяўленне культурнага праекта «Ці ведаеце вы свой Мінск?» з адпаведным узнагароджаннем прызамі (папярэдне студэнты знаёмяцца з гісторыкамі, археолагамі, пісьменнікамі, якія чытаюць лекцыі пра Мінск, затым наладжваюць спецыфічныя экскурсіі па горадзе, праводзяць конкурсы; канферэнцыі і персанальныя выставы студэнтаў, падпарадкаваныя зададзенай тэме));

– **прынцып эстэтызацыі** прадугледжвае выхаванне на ўзорах высокага мастацтва (гэта і музычныя заняткі, і абмеркаванне тэатральных п’ес, і шырокае выкарыстанне на занятках у якасці дыдактычнага матэрыялу высокамастацкіх тэкстаў, удзел у тэлесустрэчах). Асабліва ярка і цікава праходзяць сустрэчы з рэжысёрамі, акцёрамі тэатраў (А. Дударавым, Г. Давыдзькам, М. Кірычэнкам, З. Белахвосцік і інш.) пасля прагляду спектакляў у загадзя арэндаванай толькі для студэнтаў БДТУ зале.

Як ужо раней адзначалася, выхаванне ладзіцца на аснове здабыткаў нацыянальнай культуры. Улічваюцца наступныя крытэрыі: развіццё нацыянальнай самасвядомасці, павага да культуры нацыянальнай большасці, талерантнасць, цікавасць да мовы, гісторыі і культуры Беларусі, пераемнасць пакаленняў, удзел у стваральнай дзейнасці на карысць нацыянальнай культуры. Такім чынам, інтэграцыйны сістэмна-дзейнасны падыход, распрацаваны кафедрай згодна з Канцэпцыяй выхавання, арыентуе не толькі на свабоду і творчасць волевыяўлення выкладчыка і студэнта, але і, зыходзячы з нацыянальных патрэб, накіроўвае педагогаў на далейшае ўдасканаленне выхаваўчай працы і праяўленне педагагічнай ініцыятывы. Нельга стварыць адзінай схемы выхавання, таму што гэта непазбежна прывядзе да дагматызацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, але можна і неабходна шукаць новыя падыходы да выхавання моладзі, сугучныя з часам і патрэбамі дзяржавы ў выхаванай, духоўна багатай і інтэлектуальна развітай асобе. Таму прыменены на кафедры беларускай мовы інтэгральны сістэмна-дзейнасны падыход можна рэкамендаваць у якасці пераймання і для іншых кафедраў БДТУ.

## ЛІТАРАТУРА

1. Концепция воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Настаўніцкая газета. № 85 ад 22.02.2000
2. Лаптенок А. С. Нравственная культура общества: преемственность и новации. – Мн., 1999.
3. Об основных направлениях развития национальной системы образования // Постановление Совета Министров Республики Беларусь 12.04.1999 г., № 500.

УДК 808.2 - 07

Г. В. Козловская, преподаватель

# ФОНЕТИЧЕСКИЕ УПРАЖНЕНИЯ И ЗАДАНИЯ В СИСТЕМЕ ОБУЧЕНИЯ РУССКОМУ ЯЗЫКУ В ИНОЯЗЫЧНОЙ АУДИТОРИИ

Автор уделяет внимание вопросам фонетики, в частности вводно-фонетическому курсу как основе начального этапа обучения русскому языку в иноязычной аудитории.

The author pays attention to the problems of phonetics particularly to the introductory phonetic course. This course is a primary stage basis of studying russian language by foreigners.

Всему процессу обучения русскому языку предшествует вводно-фонетический курс, который знакомит учащихся с системой фонем русского языка, артикуляцией русских звуков, качественными особенностями русского ударения, ритмическими моделями одно-, дву- и трёхсложных слов, основными типами интонационных конструкций.

Курс рассчитан на 100-120 аудиторных часов, т.е. на 3-4 недели занятий. В течение этого курса формируются слухопроизносительные навыки, от которых во многом зависит овладение устной и письменной речью на русском языке.

По окончании ВФК учащиеся должны уметь:

- читать слоги, слова, словосочетания, предложения и короткие тексты, построенные на изученной лексике;
- задавать вопросы по изученной теме и отвечать на них;
- составлять короткое высказывание (2-3 предложения) по знакомым ситуациям;
- писать слоги, знакомые слова и короткие предложения.

В период ВФК изучается (в очень сжатом виде) лексический материал по темам «Знакомство», «Комната», «Семья». В ВФК лексический и грамматический материал подчиняется требованиям фонетики: новое слово вводится лишь после отработки звуков, входящих в его состав. То же требование соблюдается относительно ритмических моделей и интонационных конструкций.

При постановке гласных звуков особых трудностей не возникает, за исключением, может быть, постановки звука [ы], который отсутствует во многих языках. При этом используются звуки-помощники [к], [г], [х] (к этому времени уже отработанные) и благоприятная позиция [у]-[ы] у-у-у-у – ы-ы-ы.

Уделяется внимание заданиям на различение лобилизованных гласных [у]-[о], при этом используются основные тренировочные модели: слог (со-су), слово (сок-сук, завод-зовут); словосочетание, предложение.